# ТАЦЦЯНА КАСАТАЯ.
# СЛУЖБА ЖАНЧЫН У ГАРАДЗЕНСКАЙ ПАШТОВА-ТЭЛЕГРАФНАЙ КАНТОРЫ

***Крыніца публікацыі:***
Касатая, Т. Служба жанчын у гарадзенскай паштова-тэлеграфнай канторы [Электронны рэсурс] / Таццяна Касатая // Harodnia.com. – Рэжым доступу: https://harodnia.com/be/uczora/rasijskaja-impieryja/684-tatstsyana-kasataya-sluzhba-zhanchyn-u-garadzenskaj-pashtova-telegrafnaj-kantory. – Дата доступу: 16.07.2018 г.

У красавіку 1894 г. дачка гарадзенскага надворнага дарадцы Вольга Ожэ здала іспыты на веданне тэлеграфнай службы. Вынікі былі не надта паспяховыя, амаль па ўсіх прадметах экзаменацыйная камісія паставіла 3 балы. Але праз 20 год гэтая маладая, але амбітная дзяўчына стала чыноўнікам 3-га разраду і атрымала за службу ганаровыя ўзнагароды.

Пра Вольгу Ожэ нам вядома няшмат, але нават з тых звестак, якія змяшчаюцца ў фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гародні, можна рэаканструяваць службу жанчыны ў паштова-тэлеграфнай канторы ў канцы XIX – пачатку XX стст.

У той час пошта з’яўлялася адной з важнейшых дзяржаўных службаў, якая ўваходзіла ў склад Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі. Першапачаткова жанчын не дапускалі да паштовай і тэлеграфнай працы. Толькі ў другой палове XIX ст. у Расійскай імперыі было дазволена жанчынам працаваць на тэлеграфе. Пры гэтым былі ўстаноўленыя жорсткія абмежаванні: на працу прымаліся дзяўчыны не старэйшыя за 21 год, бяздзетныя ўдовы да 30 гадоў і жанчыны, якія былі ў шлюбе з супрацоўнікамі тэлеграфных устаноў.

На гарадзенскай тэлеграфнай станцыі ўжо ў 1868 г. малодшай тэлеграфісткай служыла Лізавета Аляксееўна Галавачова . Праз год, 23 кастрычніка 1869 г. нарадзілася Вольга Ожэ. Яна выхоўвалася ў гарадзенскай жаночай гімназіі. А пасля скончыла паштова-тэлеграфныя курсы.

Да падрыхтоўкі служачых паштова-тэлеграфных кантор ставіліся з усёй строгасцю і сур’ёзнасцю. Абавязковай працэдурай быў іспыт на веданне паштовай, тэлеграфнай і тэлефоннай службаў. Вольга здавала іспыты толькі на веданне тэлеграфнай службы: веды тэлеграфнай карэспандэнцыі, уменні працаваць на апараце, навыкі па тэхнічнай частцы. Дзякуючы таму, што дзяўчына вывучала нямецкую мову, яна пасля адносна паспяховага заканчэння курсаў заняла пасаду паштова-тэлеграфнага чыноўніка 5-га разраду. Праз год яна выйшла замуж за малодшага механіка ніжэйшага разраду паштова-тэлеграфнай канторы Сакалова. Такім чынам, Вольга магла і пасля шлюбу застацца тэлеграфным чыноўнікам.

Толькі з 1914 г. дзяўчаты маглі захаваць сваю пасаду, калі выходзілі замуж за супрацоўніка іншых службаў. Пры гэтым трэба было атрымаць дазвол кіраўніцтва паштова-тэлеграфнай установы . Змены ў прыёме на працу былі звязаны з пачаткам Першай сусветнай вайны. Жанчын ужо прымалі не толькі на тэлеграфную службу, але і на паштовую. Напрыклад, у 1915 г. у сувязі з недахопам мужчын, жанчыны маглі выконваць працу рассыльных пры ўмовах, што яны маюць узрост ад 21 да 36 гадоў, дастаткова адукаваныя, здаровыя і ведаюць горад. У жанчын-рассыльных была адмысловая форма: сукенка і галаўны ўбор цёмнага колеру, спецыяльныя тужурака і паліто. Пры гэтым металічны знак з нумарам жанчыны маглі насіць не на фуражцы як мужчыны, а на грудзі з левага боку.

З 1896 па 1906 гг. Вольга Сакалова служыла ў слонімскай, беластоцкай і брэст-літоўскай канторах. Асноўнай яе працай былі прыём і перадача дэпеш па апаратах. У той час не было адмысловай формы вопраткі ў жанчын паштова-тэлеграфных установ. Яны павінны былі апранаць закрытыя сціплыя сукенкі цёмных колераў.

У 1906 г. Вольга ўжо была чыноўнікам 3-га разраду. У гэты час яна ўжо вярнулася ў Гародню, дзе працягнула працу ў гарадзенскай паштова-тэлеграфнай канторы. За час службы Вольга Сакалова атрымала некалькі ўзнагарод – медаль у памяць 300-годдзя яаравання дома Раманавых. У 1915 г. – медаль “За працы па мабілізацыі 1914 г.”